*Л. М. Грыцкевіч (Мінск),*
*аспірантка Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры*

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ІХ ПЕРАЕМНАСЦІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ БЕЛАРУСІ

Традыцыя мае дачыненне да ўсіх сфер грамадскага жыцця. Яе феномен актыўна даследуецца культуролагамі ў апошнія гады. Вывучэнне тэорыі культурнай традыцыі ўяўляе надзвычайную важнасць на межах стагоддзяў і тысячагоддзяў дзеля свядомага выкарыстання законаў і механізмаў у сучаснай сацыякультурнай практыцы. Паводле вядомага даследчыка Э. С. Маркарана, "Культурная традыцыя — гэта выражаны ў сацыяльна арганізаваных стэрэатыпах групавы вопыт, які шляхам прасторава-часавай трансмісіі акумулюецца і ўзнаўляецца ў розных чалавечых калектывах"[1]. Трацыцыі знаходзяцца ў дынамічнай узаемасувязі з інавацыямі — вынікам творчай актыўнасці людзей. Працэс усталявання сацыяльна арганізаваных стэрэатыпаў адбываецца шляхам пераадольвання адных і ўтварэння новых. Іншымі словамі, узаемадзеянне паміж традыцыяй і інавацыяй можна разумець як адаптаваны механізм, які дазваляе грамадству ў цэлым і асобным яго групам прыстасоўвацца да зменлівых аб'ектыўных умоў існавання.

Традыцыя звязана з акумуляцыяй і перадачай не належачай спадчыне інфармацыі і заснавана на прынцыпах навучання. Працэс перадачы культурнага вопыту ў грамадстве адбываецца сродкамі першаснай знакавай сістэмы (мовы) — вусным шляхам. Натуральная камунікацыя адбываецца пры непасрэдных кантактах паміж настаўнікам і вучнем, выканаўцам і слухачом. Аб'ект камунікатыўнага акта выступае не толькі ў якасці спажыўца, але і як ўдзельнік культуратворчага працэсу[2].

Заснаваная на традыцыях народная культура атрымала ў сучасным гучанні назву — традыцыйная культура. Да з'яў традыцыйнай культуры адносяць матэрыяльныя і нематэрыяльныя віды мастацкай творчай дзейнасці народа (абрады, музыку, танцы, песні, прозу, вераванні, промыслы, рамёствы, касцюм і да т. п.) у іх спрадвечным выглядзе, якія сфарміраваліся ў той ці іншай мясцовасці і маюць выразны нацыянальна-лакальны каларыт. У жывым бытаванні традыцыйнай культуры ўласцівы сінкрэтызм — непадзельнасць на асобныя віды і жанры, сімвалізм, сакральна-магічная аснова, каляндарная прымеркаванасць. Гэтыя якасці характарызуюць менавіта аўтэнтычны фальклор — віды традыцыйнай культуры, якія існуюць у натуральным вясковым асяроддзі, маюць старажытныя карані, перадаюцца вусным шляхам, выяўляюцца праз носьбітаў фальклору (спевакоў, музыкаў, танцораў, казачнікаў, майстроў, знаўцаў мясцовай традыцыі і звычаяў)[3].

У Беларусі дзейнічае шырокая сетка дзяржаўных устаноў культуры клубнага тыпу (на 1.01.2001 г. іх колькасць складала 4270). 93% з іх знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. Гэта значыць, што клубныя ўстановы непасрэдна ўключаны ў сістэму сацыяльна-культурных сувязей традыцыйнага грамадскага асяроддзя. Як сацыяльны інстытут культуры, у задачы якога ўваходзіць ажыццяўленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацка-эстэтычнай, адукацыйна-выхаваўчай, камунікатыўнай, рэкрэатыўнай і іншых функцый, клубныя ўстановы выступаюць ў якасці арганізатараў і каардынатараў культурнага жыцця рэгіёнаў.

На працягу 20—90-х гадоў адбыліся відавочныя змены сацыяльнай ролі клубных устаноў у грамадстве. Раней змест іх дзейнасці падначальваўся выхаваўчай парадыгме і быў накіраваны на “фарміраванне новага чалавека”. Нацыянальна-культурныя і рэлігійныя традыцыі насельніцтва не толькі не браліся пад увагу, але і былі супрацьпастаўлены пануючай ідэалогіі, з імі вялася адкрытая барацьба. Разбуральны ўплыў зведалі не толькі грамадска-побытавыя, але сямейныя традыцыі. Ствараліся “новыя савецкія абрады”. У практыку культурна-асветніцкай работы актыўна ўкараняліся “чырвоныя” хрысціны, рэгістрацыі шлюбу і г. д. Гістарычны каляндарна-абрадавы пласт традыцыйнай культуры, які грунтаваўся на аграрнай магіі, быў на працягу некалькіх пакаленняў амаль вынішчаны з грамадскай свядомасці.

У другой палове XX стагоддзя маштабны характар натрымала тэорыя і методыка “культурнага абслугоўвання насельніцтва”. Дзейнасць устаноў культуры цалкам набыла ідэолага-палітычную накіраванасць. Мастацка-эстэтычны змест культурна-масавых мерапрыемстваў адлюстроўваўся ў колькасных паказчыках. Гігантаманія, кампанейства ўласцівы гэтаму этапу дзейнасці клубных устаноў. Вынікам стала адчужэнне людзей ад клубаў, выкараненне самаарганізацыйнага пачатку культурна-дасугавай дзейнасці, арыентацыя насельніцтва на спажывецкія інтарэсы.

З сярэдзіны 90-х гадоў пачаўся актыўны працэс пераасэнсавання месца і ролі клубных устаноў у сацыяльна-культурным жыцці рэгіёнаў. Сярод найбольш характэрных тэндэнцый у развіцці клубнай сферы ў 1996—2001 гадах належыць назваць наступныя:

**Дэмакратызацыя** — забеспячэнне актыўнага і раўнапраўнага ўдзелу грамадзян у культуратваральным працэсе.

**Дэідэалагізацыя і дэпалітызацыя** — адмаўленне ад разгляду клубнай ўстановы ў якасці цэнтра ідэйна-палітычнага выхавання грамадства. Змяненне яе арыентацыі на сацыякультурныя запатрабаванні насельніцтва і этнакультурныя традыцыі народа.

**Дэцэнтралізацыя і рэгіяналізацыя** — перамяшчэнне з цэнтра ў рэгіёны функцый размеркавання матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў, фарміравання культурных праектаў і праграм з улікам мясцовых рэсурсаў.

**Сацыяльна-культурная адаптацыя** — улік сацыяльна-дэмаграфічных, этнаканфесійных, іншых характарыстык насельніцтва, якое пражывае ў зоне абслугоўвання клубнай установы.

**Прафілізацыя (спецыялізацыя)** — адаптаванне тыпу ўстановы з наборам пэўных культурных паслуг да мясцовых умоў. Як вынік — множнасць мадэляў устаноў клубнага тыпу.

На сённяшні дзень ў Беларусі налічваецца 350 клубных устаноў новага тыпу. Шырокую распаўсюджанасць атрымалі дамы фальклору, цэнтры нацыянальнай культуры, клубы-бібліятэкі, цэнтры моладзі, культуры і вольнага часу, эстэтычнага выхавання.

Адраджэнне і развіццё нацыянальна-культурных традыцый вылучана ў ранг прыярытэтаў дзейнасці клубных устаноў. За апошнія 6—10 гадоў пошукава-экспедыцыйнай, навукова-даследчай, нарматворчай і іншых работ, якія актыўна вяліся супрацоўнікамі Нацыянальнай акадэміі навук, Беларускага дзяржаўнага інстытута

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблем культуры ў непасрэднай сувязі з абласнымі, раённымі метадычнымі цэнтрамі культуры і народнай творчасці, зроблены значны крок у напрамку вывучэння і актуалізацыі рэгіянальных этнакультурных традыцый, уключэння клубных установ у працэс забеспячэння пераемнасці. Самым значным дасягненнем, на наш погляд, тут з'яўляецца спалучэнне сучасных інстытуцыянальных форм (спецыялізаваная ўстанова — школа, Дом рамёстваў, фальклору і г.д., гурток, майстэрня, урочны тып заняткаў) і традыцыйных метадаў навучання (вусны (беспісьмовы), з голасу, капіраванне, імітацыя). Захаванне прынцыпаў непасрэднага (кантактнага) тыпу камунікацыі, якое дасягаецца пры ўдзеле ў працэсе навучання носьбітаў (знаўцаў) традыцыі, гарантуе засваенне першакрыніцы ў цэласным выглядзе, актывізуе творчы патэнцыял навучэнцаў.

Ва ўмовах разбурэння і разбалансаванасці спрадвечных каналаў перадачы культурнай інфармацыі (сям'я, абшчына) узрастае роля работнікаў культуры ў забеспячэнні пераемнасці традыцый. Яны мэтанакіравана вывучаюць мясцовыя каляндарна-абрадавыя, спеўныя і танцавальныя традыцыі, выступаюць у якасці настаўнікаў для дзяцей і моладзі. Ім належыць ініцыятыва ўзнаўлення традыцыйных свят і абрадаў, стварэння самадзейных калектываў[4].

Падтрымка форм аматарскай мастацкай творчасці, якая ажыццяўляецца на дзяржаўным узроўні, таксама дае свой плён. У клубных установах краіны працуе каля 26 тысяч рознажанравых калектываў аматарскай творчасці. Сярод іх нязменнае лідэрства належыць фальклорным. Рэпертуар гэтых калектываў фарміруецца галоўным чынам з рэгіянальна адметных абрадавых і пазаабрадавых твораў.

Трэба са ўсёй сур'ёзнасцю асэнсаваць ролю ўстаноў культуры ў працэсе забеспячэння пераемнасці нацыянальна-культурных традыцый. Работнікі культуры могуць унесці тут значны ўклад. Неабходна авалоданне работнікамі культуры методыкай работы з аўтэнтычным фальклорам. У практыцы клубнай работы трэба забараніць умяшальніцтва ў праявы традыцыйнай культуры, якія маюць сакральна-магічную сутнасць. На этапе вывучэння рэгіянальных культурных традыцый належыць абіраць шляхі фіксацыі, што найбольш цэласна адлюстроўюць з'яву (відэафіксацыю абраду; запіс спеваў у старажытнай спеўнай манеры, у мнагагалосным выкананні, на якаснай гуказапісваючай апаратуры; каляровыя фотаздымкі касцюмаў; расшыфроўка арнаментаў і г. д.). Галоўным падыходам да праяў культурнай традыцыі з'яўляецца фрагментацыя вопыту мінулага (сюжэтаў, сімвалаў, знакаў, тэкстаў, мелодый, лексічных асаблівасцей народнай харэаграфіі, элементаў нацыянальнага касцюма, народна-прамысловых тэхналогій і інш.) з далейшай яго стэрэатыпізацыяй у розных сферах культурнага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[1] *Маркарян Э. С.* Узловые проблемы теории культурной традиции // Сов. этнография. 1981. № 2. С. 80.

[2] *Чистов Т. В.* Специфика фольклора в свете теории информации // Типологические исследования по фольклору: Сб. статей памяти В. Я. Проппа. М., 1975. С. 26–43.

[3] *Варфаламеева Т. Б., Боганева А. М.* Ахова, захаванне, пераемнасць і папулярызацыя беларускага аўтэнтычнага фальклору: Канцэптуальныя асновы і рэкамендацыі // Веснік: Нав.-метад. зб. Мн.: БелДІПК, 2001. С. 55.

[4] *Голубева І. Р.* Роля калектываў самадзейнай народнай творчасці ў захаванні і перадачы культурнай традыцыі // Веснік. Нав.-метад. зб. Мн.: БелІПК, 1998. С. 70–78.